ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
2
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 21 (1397)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### З ЛЕКЦЫЯЙ

аб міжнародным становішчы перад студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта выступіў член Саюза журналістаў СССР, супрацоўнік часопіса «Международная жизнь» Ю. А. Лосеў. Ён расказаў прысутным аб барацьбе Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада за мір, разбраенне і міжнароднае супрацоўніцтва.

А. ФАМІЧОЎ.

### НЕЗАБЫЎНЫЯ ЎСПАМІНЫ

пакінуў фестываль інтэрнацыянальнай дружбы, які прайшоў у Ужгарадзе. У ім прынялі ўдзел самадзейныя калектывы і артысты універсітэта: народны ансамбль танца «Крыжачок», фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», народны аркестр народных інструментаў, а таксама лаўрэат рэспубліканскага конкурсу палітычнай песні і V Інтэрнацыянальнага студэнцкага фестывалю ў Маскве выкладчык А. Ацьман. У час фестывалю яны сустрэліся з удзельнікамі ансамбля песні і танца «Шовкова косиця» Ужгарадскага універсітэта.

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

### 60-ГОДДЗЮ

першага ў свеце антыфашысцкага ўзброенага паўстання ў Балгарыі прысвячалася X савецка-балгарская студэнцкая навуковая канферэнцыя, што прайшла ва універсітэце. З уступным словам выступіў доктар гістарычных навук, прафесар Д. Б. Мельцар.

Выступаючыя Р. Сечкаў, А. Садзельскі, Н. Стоева, А. Рудэнка, Н. Тамашова расказалі прысутным аб першым антыфашысцкім паўстанні, аб адным з яго кіраўнікоў Г. Дзімітраве, выказалі думкі наконт адлюстравання вераснёўскага паўстання 1923 года ў балгарскай літаратуры і інш.

А. ЯНОЎСКІ,
выкладчык кафедры гісторыі СССР.

### ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ЧЫТАННІ

арганізуе універсітэт. З першай лекцыяй «Карл Маркс і сучаснасць» выступіў на ВА «Інтэграл» дацэнт ІПК Ю. А. Васільеў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.



## ПОШУКІ САЦЫЁЛАГАЎ

*НАВУКОВА - ДАСЛЕДЧАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ сацыялагічных даследаванняў БДУ імя У. І. Леніна існуе ўжо больш пятнаццаці гадоў. У 1973 годзе быў арганізаваны аддзел праблем студэнцкай моладзі. Даследаванні супрацоўнікаў аддзела прысвечаны самым разнастайным аспектам дзейнасці студэнцтва: праблемам фарміравання грамадска - палітычнай актыўнасці моладзі, яе прафесійнай накіраванасці, вывучэнню перспектыў такой, ужо добра сябе зарэкамендаваўшай формы сувязі універсітэцкай навукі з вытворчасцю, як вучэбна-навуковыя вытворчыя аб'яднанні.*

*Сёння вучоныя працуюць над пытаннямі ўдасканалення сістэмы прафесійнага выхавання студэнтаў у ВНУ, патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання студэнтаў на прыкладзе работы БДУ і Сафійскага універсітэта, удасканалення сістэмы маральна-прававога выхавання студэнцтва.*

*Праблемы, якімі займаецца аддзел, неаднаразова былі прадметам абмеркавання на бюро абкома, гаркома партыі. Рэзультаты даследаванняў, выкананых пераважна па заданню партыйных, камсамольскіх органаў, а таксама адміністрацыі БДУ, выкарыстоўваюцца ў практычнай рабоце гэтых арганізацый, некаторыя з распрацовак улічваюцца пры складанні рэспубліканскай комплекснай праграмы «Моладзь і навукова-тэхнічны прагрэс».*

*Супрацоўнікі лабараторыі прымаюць удзел у вучэбным працэсе: чытаюць спецкурс па прыкладной сацыялогіі для аспірантаў інстытута замежных моў, выкладаюць філасофскія дысцыпліны, вядуць семінарскія заняткі, кіруюць дыпломнымі і курсавымі работамі студэнтаў філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта. Але іх дзейнасць не абмяжоўваецца толькі рамкамі вышэйшых навучальных устаноў: заключаны дагавор аб творчым супрацоўніцтве з Беларускім рэспубліканскім навукова-вытворчым аб'яднаннем парашковай металургіі па вывучэнню пытанняў прафесійнага выхавання маладых спецыялістаў.*

*Студэнтам — будучым сацыёлагам — дарога ў лабараторыю таксама не закрыта. Многія з іх ужо працуюць тут: складаюць табліцы, сарціруюць анкеты, пішуць рэфераты, удзельнічаюць у даследаваннях. Магчыма таму не выклікае здзіўлення той факт, што аснову калектыву супрацоўнікаў аддзела праблем студэнцкай моладзі складаюць выпускнікі нашага універсітэта.*

Н. КАЛІШЭВІЧ.

**НА ЗДЫМКУ:** загадчык аддзела праблем студэнцкай моладзі, кандыдат філасофскіх навук У. А. Дунаеў, малодшыя навуковыя супрацоўнікі Ю. А. Шаўлюкоў, Л. Г. Новікава, С. М. Ерамейцава аналізуюць атрыманую інфармацыю.

Фота В. Шачака.

КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЕ

## УДАСКАНАЛЬВАЦЬ РАБОТУ

АДБЫЛОСЯ ЧАРГОВАЕ пасяджэнне бюро ЦК ЛКСМ Беларусі, на якім разгледжана работа камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна па выкананню рашэнняў XIX з'езда ВЛКСМ. Бюро адзначыла мэтанакіраваную арганізатарскую і палітычную работу камітэта камсамола універсітэта па камуністычнаму выхаванню студэнтаў. Разам з тым было падкрэслена, што камсамольскай арганізацыі БДУ патрэбна больш настойліва і эфектыўна вырашаць пытанні, пастаўленыя перад камсамолам краіны XIX з'ездам ВЛКСМ. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на ўдасканаленне сістэмы грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, барацьбу за высокую паспяховасць і набыццё неабходных для будучай работы ведаў.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

## НАЗВАНЫ ЛЕПШЫЯ

У ЧАРГОВЫ РАЗ падведзены вынікі конкурсу на лепшую пастаноўку вынаходніцкай і рацыяналізатарскай работы на кафедрах і ў лабараторыях універсітэта. У конкурсе прынялі ўдзел 29 кафедр прыродазнаўчага профілю і лабараторый навукова-даследчых інстытутаў ФХП і ПФП імя А. Н. Сеўчанкі. Па выніках конкурсу першае месца прысуджана калектыву лабараторыі аналага-лічбавых метадаў вымярэнняў НДІ ПФП, другое месца заняла лабараторыя фізічнай хіміі НДІ ФХП, трэцяе месца—у лабараторыі экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў НДІ ФХП.

Трэба адзначыць, што лабараторыя экстракцыйных і сарбцыйных працэсаў НДІ ФХП другі раз займае прызавое месца на працягу трох апошніх гадоў.

Конкурс паказаў узросшую актыўнасць вынаходнікаў усіх падраздзяленняў. У параўнанні з мінулымі гадамі павялічана колькасць вынаходніцтваў, укаранёных на прадпрыемствах.

Адначасова былі падведзены вынікі конкурсу на лепшага вынаходніка універсітэта 1982 года. Імі сталі загадчык лабараторыі НДІ ПФП І. А. Малевіч, другое месца заняў загадчык лабараторыі НДІ ПФП Д. А. Ашкінадзе. Трэцяе і наступныя месцы размеркаваліся так: в. а. дацэнта кафедры ядзернай фізікі У. М. Лінёў, загадчык аддзела кафедры ядзернай фізікі Я. Я. Фурса, асістэнт кафедры агульнай фізікі В. М. Навумчык.

Лепшым маладым вынаходнікам прызнаны малодшы навуковы супрацоўнік кафедры ядзернай фізікі А. Л. Халмецкі.

**В. ЯМНЫ,**
**старшыня савета ўсесаюзнага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў універсітэта.**

## Сардэчна віншуем!

**Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі:**

**Міхаіл Сямёнавіч МЯЦЕЛЬСКІ** — кафедра педагогікі, навуковы кіраўнік прафесар **М. І. Піскуноў;**

**Сяргей Кірылавіч ПАГРАБНЯ** — фізічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **М. А. Ельяшэвіч;**

**Мечаслаў Эдуардавіч ЧАСНОЎСКІ** — гістарычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **І. В. Царук;**

**Наталля Мікалаеўна МЯШКОВА** — юрыдычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **В. Ф. Чыгір;**

**Васіль Васільевіч ЦІМОШЧАНКА** — юрыдычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **І. І. Гарэлік;**

**Георгій Сцяпанавіч ДРАБЯЗКО** — юрыдычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **В. Ф. Чыгір;**

**Марына Аляксандраўна МАЖЭЙКА** — кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **В. С. Сцёпін;**

**Таццяна Леанідаўна КЛЯЦКОВА** — кафедра палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, навуковы кіраўнік дацэнт **У. І. Максін;**

**Аркадзь Яфімавіч ЛЮЛЬКІН** — ВЦ, навуковы кіраўнік прафесар **А. Д. Закрэўскі;**

**Анатоль Пятровіч ПАПКОЎ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік дацэнт **А. У. ПРАКУРАЎ;**

**Уладзімір Іванавіч БЕЛАБРОВІК** — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі дацэнты **І. П. Зяцькоў, Д. А. Ашкінадзе;**

**Валерый Сяргеевіч САЛАЎЁЎ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік старшы навуковы супрацоўнік **Ф. Ф. Камароў;**

**Наталля Васільеўна ЛОГІНАВА** — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік прафесар **В. В. Свірыдаў;**

**Надзежда Георгіеўна ЦЫГАНКОВА** — НДІ ФХП, навуковыя кіраўнікі прафесар **Ф. М. Капуцкі,** старшы навуковы супрацоўнік **Д. Д. Грыншпан;**

**Сяргей Анатольевіч ПАВАЛЯЕЎ** — НДЧ, навуковыя кіраўнікі прафесары **Б. А. Беняздзіктаў, Г. П. Давыдзюк;**

**Алег Цімафеевіч МАНАЕЎ** — праблемная навукова-даследчая лабараторыя сацыялагічных даследаванняў, навуковы кіраўнік прафесар **Г. П. Давідзюк;**

**Надзежда Якаўлеўна ГАЛУБКОВА** — праблемная навукова-даследчая лабараторыя сацыялагічных даследаванняў, навуковы кіраўнік прафесар **Г. П. Давідзюк.**

**Жадаем новых творчых поспехаў!**



ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# Дабівацца большага

*Чытачы газеты, напэўна, звярнулі ўвагу на выступленні на старонках «Беларускага універсітэта» сакратара партыйнага бюро ФПМ М. Федзяні, у якіх аўтар узнімаў пытанні вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны на факультэце, расказваў аб маральным і працоўным выхаванні студэнтаў, дзяліўся вопытам партыйнай работы.*

*Аб тым, што хвалюе камуністаў факультэта прыкладной матэматыкі сёння, аб праблемах, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй ФПМ, і вялася размова на справаздачна-выбарным сходзе.*

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ з'яўляецца палітычным ядром любога калектыву. Ад яе жыццядзейнасці ў вялікай ступені залежыць грамадская актыўнасць савецкага чалавека. Свой уклад у агульную справу ўносіць і партыйная арганізацыя факультэта прыкладной матэматыкі, якая налічвае сёння 52 члены і кандыдаты ў члены КПСС.

Выступаючы са справаздачным дакладам, сакратар партыйнага бюро факультэта М. Федзяня адзначыў, што сваю дзейнасць камуністы факультэта накіроўвалі на рашэнне задач, пастаўленых перад партыйнымі арганізацыямі XXVI з'ездам КПСС, Пленумамі ЦК КПСС. З мэтай дасягнення большай эфектыўнасці партыйнага кіраўніцтва жыццём факультэта партыйнае бюро сур'ёзна ставілася да арганізацыі і правядзення партыйных сходаў, засяроджвала сваю ўвагу на галоўных, вузлавых пытаннях.

Разам з тым на ФПМ не здолелі пазбавіцца ў сваёй рабоце ад колькаснага падыходу, ад пунктаў «узмацніць», «палепшыць». Гэта сведчыць аб тых задачах, што стаяць перад камуністамі факультэта і якія неабходна рашаць сумеснымі намаганнямі камуністаў і беспартыйных.

Партыйнае бюро факультэта значную ўвагу ўдзяляла кадравым пытанням, а таксама ўмацаванню партыйнай дысцыпліны. За справаздачны перыяд на пасяджэннях бюро былі заслуханы справаздачы 11 камуністаў аб выкананні імі патрабаванняў Статута партыі і даручэнняў. І заўжды наперадзе былі такія камуністы, як А. Ераксін, Ю. Харын, В. Малышка, У. Гайдыш, У. Бабкоў, М. Труш, Л. Панчанка.

Адным з галоўных напрамкаў работы партыйнага бюро з'яўляецца ідэалагічная, палітыка-выхаваўчая работа. Змест яе вызначаюць вывады і ўказанні XXVI з'езда КПСС, пастановы ЦК КПСС, прысвечаныя 60-годдзю ўтварэння СССР, 80-годдзю II з'езда РСДРП, рашэнні майскага і лістападаўскага (1982 г.) Пленумаў ЦК КПСС.

У цэнтры ідэалагічнай работы, як заўсёды,—пастаноўка і змест партыйнай вучобы на факультэце. Сёння можна з поўным правам сказаць, адзначыў М. Федзяня, што сістэма партыйнай адукацыі на ФПМ характарызуецца добрым тэарэтычным узроўнем, актыўнасцю слухачоў, выкарыстаннем ведаў у вучэбна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі.

Аднак, гаворачы аб узроўні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы, падкрэсліў дакладчык, патрэбна самакрытычна сказаць — работы яшчэ вельмі многа. У нас нізкі ўзровень ведаў па грамадскіх навуках у некаторых студэнтаў-камсамольцаў, сустракаюцца выпадкі п'янства, нізкая грамадска-палітычная актыўнасць асобных студэнтаў як малодшых, так і старэйшых курсаў.

Гэтыя і іншыя недахопы гавораць аб тым, што партыйнай арганізацыі патрэбна актывізаваць ідэалагічную, палітыка-выхаваўчую работу. Калі на вытворчасці цэнтр цяжару перамяшчаецца сёння ў брыгаду, то ў ВНУ, на факультэце, такім цэнтрам павінна стаць група.

Месца жыхарства — месца выхавання — такая думка прагучала ў дакладзе сакратара партбюро. За гэты ўчастак работы адказвалі камуністы Ю. Харын і У. Гайдыш. Была створана камісія па рабоце ў інтэрнатах. Укаранёна новая методыка планавання ўсіх мерапрыемстваў у інтэрнатах, на кожны месяц распрацоўваўся і зацвярджаўся комплексны план работы. Асаблівая ўвага ўдзялялася правядзенню выхадных дзён, паляпшэнню ўзроўню ідэйна-выхаваўчых мерапрыемстваў, стану нагляднай агітацыі. Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1982 год інтэрнат № 6 заняў другое месца ва універсітэце.

Далей дакладчык спыніўся на пытаннях удасканалення вучэбнага працэсу, павышэння эфектыўнасці НДР. Дрэнныя паспяховасць і наведванне лекцый павінны разглядацца як парушэнні працоўнай дысцыпліны, сказаў ён. Камсамольскім бюро груп і кафедраў, камітэту камсамола, «КП» патрэбна аператыўна і своечасова рэагаваць на ўсе выпадкі яе парушэння.

Разам з тым, адзначыў дакладчык, нас не можа задаволіць узровень работы штаба «КП», ідэалагічнага і ваенна-патрыятычнага сектара, арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі, работа асобных камсамольскіх бюро груп і кафедраў. Недастаткова эфектыўным з'яўляецца кантроль за якасцю правядзення палітінфармацый, камсамольскіх сходаў у групах. Камітэту камсамола, камсамольскім бюро груп і кафедраў, куратарам неабходна пастаянна клапаціцца аб умацаванні калектыву студэнцкіх груп.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва факультэт прыкладной матэматыкі ўпершыню за час свайго існавання заняў другое месца ва універсітэце. Гэта вынік настойлівай, мэтанакіраванай работы ўсяго калектыву факультэта. Аднак утрымаць высокае месца ў сацыялістычным спаборніцтве — задача яшчэ больш складаная. У гэтым плане факультэту ёсць над чым папрацаваць.



Выступаўшыя ў спрэчках камуністы спыняліся на тых пытаннях, што патрабуюць хутчэйшага вырашэння, адзначылі вялікую работу партыйнага бюро факультэта, яго сакратара.

Нацэленасць на павышэнне канчатковых вынікаў работы, імкненне дабівацца большага ў партыйнай дзейнасці — іменна гэтым вызначаўся сход на факультэце прыкладной матэматыкі.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**

З НАШАЙ ПОШТЫ

## ШКОЛЫ РЭВАЛЮЦЫІ

**У ГЭТЫЯ ДНІ ўсе аманскія студэнты на радзіме і за мяжой адзначаюць дзень аманскага студэнта і 13-ю гадавіну ўтварэння школ аманскай рэвалюцыі. Гэтыя школы былі створаны па ініцыятыве Народнага Фронту Вызвалення Амана (НФВА).**

**Да стварэння гэтых школ у Амане існавалі толькі дзве пачатковыя — для дзяцей чыноўнікаў, а 95 працэнтаў насельніцтва было непісьменным.**

**Пасля рэвалюцыі пачынаецца барацьба за ліквідацыю непісьменнасці — адкрываецца першая школа для дзяцей беднякоў. Сотні аманскіх дзяцей паступілі ў яе. Нягледзячы на цяжкія ўмовы школы рэвалюцыі выжылі і развіваюцца.**

**І ў дні 13-й гадавіны ўтварэння школ я, як адзін з выпускнікоў, хацеў бы падзякаваць тым, хто працягнуў нам руку дапамогі, асабліва сябрам з Савецкага Саюза.**

**АХМЕД АЛІ МУХАМЕД,**
**член інтэрпрэс-цэнтра.**

## З юбілеем!

**АСАБЛІВА ВОСТРА адчуваецца імклівы бег часу, калі сустракаешся з людзьмі занятымі.**

**Зрабіць шмат карыснага, добрага не заўсёды і не кожнаму ўдаецца. Для гэтага патрэбен пачатак, а час, няўмольны і хуткі, падвядзе пад зробленым рысу. Ці можна лічыць такой рысай для загадчыка кафедры фізічнай электронікі А. А. Лабуды яго 60-гадовы юбілей! Усіх спраў, адзначаных у віншавальнай насценнай газеце, не пералічыць: скончаны фізічны факультэт БДУ, абаронена кандыдацкая дысертацыя, напісана звыш 90 навуковых прац. Антон Антонавіч быў першым дэканам факультэта, яго вучнямі абаронена 4 кандыдацкія дысертацыі... Успамінаць можна многа, а новых спраў наперадзе яшчэ больш.**

**Ці хочацца ў мірны працоўны дзень габарыць пра вайну! Па яго твары прабег цень і знік у складках маршчын.**

**Пачынаў ваяваць летам 1944 года ў разведцы, калі наша армія вызваляла Беларусь. Дайшоў да Усходняй Прусіі, узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Потым перакінулі на Усход супраць мілітарысцкай Японіі. Прайшоў бязводныя стэпы Маньчжурыі, перайшоў цераз хрыбет Хінган. За паспяховае выкананне заданняў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.**

**Рана яшчэ падводзіць рысу пад зробленым. Можна лічыць, што юбілей Антона Антонавіча —гэта яшчэ адзін важны этап у яго жыцці.**

**Л. СТУКАЛАВА.**

МАСТЫ ДРУЖБЫ

## «МАЕ БЕЛАРУСКІЯ ДРУГАРЫ...»

ЗВАНКА Ў ГЭТАЙ аўдыторыі нібы не чуюць. На перапынак не спяшаюцца. Ажыўлена размаўляюць беларускія студэнты на балгарскай мове. І гэта прыносіць ім вялікае задавальненне, хоць Цветан Драганавіч Йотаў, выкладчык балгарскай мовы на філалагічным факультэце, сёння шчодры не на пахвалу, а на заўвагі.

— Націск усё ж беларускі! Сачыце за гэтым.

Сам Цветан Драганавіч цудоўна гаворыць па-руску, у ім немагчыма прызнаць замежнага чалавека. І гэта не дзіўна: захапленне рускай мовай паявілася ў яго з малых гадоў. Маці чытала апавяданні Талстога, вершы Лермантава. Дзед яго Петэр Табакуў спяваў рускія песні. Дзесяцігадовы Цветан ўзяў у рукі рускую кнігу.

Ужо к пятаму класу гімназіі, калі пачыналася вывучэнне рускай мовы, ён добра ведаў яе, а к заканчэнню вучобы паспяхова размаўляў і чытаў па-руску. У глыбіні душы жыла запаветная мара пабываць у краіне Леніна.

Ён убачыў яе ў радасны дзень. Грымелі ўрачыстыя маршы, гучалі песні, усмешкі на тварах. На галоўнай плошчы краіны праходзіў ваенны парад. Цветан Йотаў, які прыехаў на курсы рускай мовы, стаяў на трыбунах для гасцей. Калі на плошчу выехалі танкі, яму ўспомнілася, як такія ж машыны з чырвонымі зоркамі на брані прынеслі яго радзіме вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Забраўшыся тады разам з іншымі хлапчукамі на дах, ён стараўся не праміну́ць галоўнага — першага савецкага воіна, якога ўяўляў чамусьці з выгараўшым пшанічным чубам і блакітнымі вачыма.

Пасля разгрому фашызму пачалася новая старонка ў жыцці Балгарыі, якая дазволіла яму і тысячам іншых дзяцей працоўных атрымаць недаступную раней вышэйшую адукацыю. Цветан Драганавіч лічыць, што яму вельмі пашанцавала. Ён закончыў аспірантуру Маскоўскага педагагічнага інстытута і першым з замежных навучэнцаў абараніў там кандыдацкую дысертацыю па рускай мове. У сябе на радзіме выкладаў рускую мову ў Сафійскім універсітэце. Яму падабалася тая захопленасць, з якой моладзь вывучала рускую мову. Разам з імі вучыўся і сам: мова — гэта бязмежнае мора. Каб яе разумець, патрэбна пастаянна ўдасканальваць гутарковую мову.

Вось для гэтага Цветан Драганавіч зноў прыехаў у нашу краіну, выкладае ў БДУ імя У. І. Леніна. Вярнуўшыся ў Сафію, мяркуе скласці моўны практыкум па рускай мове для студэнтаў усіх факультэтаў універсітэта.

Год работы падыходзіць к канцу. Адначасова з чытаннем лекцый Йотаў займаецца параўнаўчым вывучэннем блізкароднасных моў, у прыватнасці рускай, беларускай і балгарскай. Групы ў яго таксама інтэрнацыянальныя. З такімі, зразумела, складаней. Але Цветан Драганавіч задаволены беларусамі Анатолем Радзевічам, Інай і Таццянай Мароз, рускай Кацярынай Папкавец, сёстрамі-блізнятамі з Грузіі Ірынай і Нанай Пацыя, кіпрыёткай Аленай Лука, афганцамі Асманам і Муменам, В. Прыянта з Шры Ланкі, Ф. Панайотупулу з Грэцыі. Праходзяць такія заняткі не зусім звычайна. Студэнты ловяць кожнае слова адзін аднаго, стараюцца запомніць і паспрабаваць у размове.

— Гляджу на вясёлыя твары студэнтаў, а бачу руіны Мінска, — гаворыць Цветан Драганавіч, — і думаю, якое шчасце, што гэта ў мінулым. Старэйшае пакаленне, да якога належу я, павінна зрабіць усё, каб жахі вайны ніколі не паўтарыліся. Зближаць моладзь розных краін, дапамагчы ёй пераадолець моўны бар'ер — вось у чым я бачу прызначэнне сваёй прафесіі.

На лекцыях балгарскім студэнтам ён будзе расказваць і аб нашай краіне. Ужо зараз рыхтуецца да гэтага. Па крупінках збірае, напрыклад, беларускі гумар, лічыць, што ён падобны да габраўскага.

Дасканала разабрацца ў тонкасцях беларускай мовы дапамагаюць яму студэнты ці, як ён гаворыць аб іх, «мае беларускія другары».

Вось і зараз заходзяць у аўдыторыю, па даўняй дамоўленасці вітаюцца з Цветанам Драганавічам толькі па-беларуску

— Дзень добры!

— Дзень добры, праходзьце, калі ласка! — старанна хаваючы акцэнт, адказвае выкладчык.

— Усё правільна, — хітра ўсміхаюцца студэнты, — але націск балгарскі. Сачыце за гэтым!

І добрыя ўсмешкі свецяцца ў іх вачах.

**Г. КАШТАНАВА.**

## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

ЗАКАНЧВАЕЦЦА другі семестр навучальнага года. Застаўся апошні рывок — сесія. А потым — трэці працоўны. Для многіх студэнтаў пачнецца працоўная біяграфія.

Для нашага будатрада «Мінск-83» гэты семестр будзе вельмі адказным. Байцам выпала ганаровая місія — прадстаўляць зводны студэнцкі атрад БДУ імя У. І. Леніна ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. У яго састаў увайшлі лепшыя прадстаўнікі факультэтаў.

# Ганаровая місія

Хачу расказаць аб падрыхтоўчым перыядзе ў нашым будатрадзе. Тут дарэчы спыніцца на грамадска - палітычнай рабоце. Яна праводзіцца па некалькіх напрамках. Галоўная ўвага ўдзяляецца ідэйна-палітычнай загартоўцы байцоў. Стала традыцыяй кожны тыдзень рабіць агляды палітычных падзей. З цікавымі паведамленнямі выступілі Г. Грынкевіч, А. Яркавіч, Г. Маркевіч. З дапамогай В. Бразінскай мы бліжэй пазнаёміліся з гісторыяй, культурай і сённяшнім днём ГДР.

У моладзі свету ёсць вялікая і важная справа — барацьба за мір. Гэтая тэма стала галоўнай у рабоце агітбрыгады. Р. Корзун і А. Яркавіч распрацавалі актуальны сцэнарый «Не дадзім узарваць мір!». У праграме гарманічна спалучаюцца вершы Пабла Неруды і песні Джона Ленана, лаканічныя радкі газетных паведамленняў і кранаючыя сэрца пісьмы дзяцей Лацінскай Амерыкі. Старанна рыхтуецца канцэртная праграма. У ёй будуць адлюстраваны багатая песенная творчасць нашага народа, беларускія байкі, вершы савецкіх і нямецкіх паэтаў і, зразумела, дасціпны студэнцкі гумар.

На адным са сходаў байцы атрада аднагалосна выбралі ганаровым членам атрада вядомага дзеяча Камуністычнай партыі Савецкага Саюза Пятра Міронавіча Машэрава. Байцы рыхтуюць экспазіцыю, стэнды якой раскажуць аб жыцці і дзейнасці П. М. Машэрава, аб гісторыі і дасягненнях нашай рэспублікі, аб яе культуры, навуцы, аб жыцці моладзі. Для азнаямлення студэнтаў Йенскага універсітэта, з якімі мы будзем працаваць, з нашай рэспублікай і універсітэтам члены лектарскай групы рыхтуюць матэрыялы на нямецкай мове.

**В. МАЛАФЕЕЎ,**
**камісар СБА «Мінск-83».**

*АБ СХОДЗЕ АТРАДА паведамляла аб'ява. І вось у вызначаны час СБА хімфака «Купалінка» — у зборы. Гэта адна з апошніх сустрэч: праз некалькі тыдняў юнакі і дзяўчаты ўжо будуць на палях сонечнай Малдавіі. Таму на сходзе вырашаліся апошнія праблемы, вызначаўся састаў рабочых брыгад, шмат пытанняў было зададзена камандзіру атрада Таццяне Гулькевіч. Гэта і не дзіўна: многія едуць у Малдавію ўпершыню. Пройдзены медагляд, праведзены суботнікі. А зараз— прага рамантыкі, жаданне дапамагчы сваёй справай Радзіме, жаданне ў складаных умовах праверыць свой характар, свае сілы, моц сяброўскіх адносін.*

*НА ЗДЫМКАХ: сход атрада «Купалінка»; першае знаёмства з Малдавіяй — па прыгожа афармленай насценгазеце (злева — камандзір атрада Таццяна Гулькевіч).*







## НА КАЛЕНДАРЫ— ЛЕТА

# АДПАЧЫВАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА!

УСЁ ЗРАЗУМЕЛА: у цябе пакуль што ў думках сесія. Ні сну, як кажуць, ні адпачынку. Залікі, экзамены... І не верыцца, што калі-небудзь гэта скончыцца. Але канец усё ж прыйдзе, і можна будзе закінуць да наступнага навучальнага года падручнікі, а стрэлкі будзільніка з сямі перавесці гадзін так на дзесяць...

Адпачынак. Дзень, другі... А потым? Потым зноў пацягне ў студэнцкую сям'ю, захочацца карыснай справы. Надакучыць спакой. І тады самы час звярнуцца ў студэнцкі прафком, які прапануе:

— адпачынак у спартыўна-аздараўленчым інтэрнацыянальным лагеры «Нарач». Кошт пуцёўкі—15 рублёў, тэрмін—20 дзён.

Можа здарыцца так, што ў цябе раптам паявіцца жаданне папрацаваць. Тут таксама можна дапамагчы:

— згодна з дагаворам, заключаным адміністрацыяй універсітэта і дырэкцыяй крымскіх саўгасаў, арганізаваны лагеры працы і адпачынку «Гурзуф» і «Феадосія». У праграму ЛПА ўваходзяць выкананне штодзённай нормы на прапалцы вінаграднікаў, разнастайныя спартыўныя мерапрыемствы, экскурсіі.

У цябе не вельмі добра са здароўем? ў гэтым выпадку звяртайся ў прафком:

— студэнты універсітэта змогуць атрымаць ільготныя пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку, на турбазы.

Твае педагагічныя здольнасці патрабуюць неадкладнага прымянення? Калі ласка:

— студэнты маюць магчымасць працаваць важатымі і выхавацелямі ў піянерскім лагеры «Брыганціна», які размясціўся на Крымскім паўвостраве.

Магчыма, ты аматар турызму? Паходы выхаднога дня, турысцкія падарожжы, паходы па месцах баявой і працоўнай славы арганізуе для цябе спартыўны клуб.

Як бачыш, магчымасць выбару ёсць. Мяркуй, збірайся—і наперад. Няхай запомніцца табе лета добрымі справамі, новымі знаёмствамі, цікавымі падарожжамі. Прыемнага адпачынку, студэнт!

**М. ДРОЗД,**
**старшыня студэнцкага прафкома.**

## СПРАВЫ ІНТЭРНАЦКІЯ

# КАЛІ Ў ДОМЕ ДОБРЫ ГАСПАДАР

**ГЕНАДЗЬ ПАЛЬЧЫК — старшыня студсавета — стомлена паглядзеў на гадзіннік: маленькая стрэлка няўмольна набліжалася да адзінаццаці. Значыць, пасяджэнне працягваецца ўжо тры гадзіны. І абмяркоўваюцца тут набалелыя пытанні, ідзе дзелавая размова аб тым, як канкрэтнымі справамі палепшыць быт жыхароў. Кароткімі «пяцімінуткамі» тут не абысціся. Часта студсавет вырашае лёс чалавека — пакінуць у інтэрнаце ці ўзяць на яго месца другога, больш дысцыплінаванага.**

**Вось і зараз Валерый Багіян, намеснік Генадзя, дастаў са стала раней адкладзеныя карткі студэнтак, якія жывуць у пакоі 1101 б. У графе «Спагнанні» ў кожнай з картак лаканічны запіс: «За сістэматычнае парушэнне санітарнага стану пакоя студэнтка умоўна выселена». Умоўна — значыць, да першай заўвагі з боку студсавета ці камітэта камсамола. Ці ведалі аб гэтым дзяўчаты! Бясспрэчна. І нягледзячы на гэта рэйдавая брыгада «Камсамольскага пражэктара» зноў, у каторы ўжо раз, застала пакой запушчаным. Фармальна можна ўсіх гэтых студэнтак выселіць. Але студсавет у такіх выпадках паступае, як правіла, па-другому.**

**— Давайце выслухаем яшчэ раз дзяўчат, а потым ужо вынесем рашэнне, — прапануе Сяргей Бяспалы.**

**І вось шэсць першакурсніц фізічнага факультэта апраўдваюцца, кожная па-свойму тлумачыць прычыны.**

**Узважыўшы ўсе «за» і «супраць», студсавет большасцю галасоў вынес рашэнне: Н. Рыбакову выселіць, астатнім пяці студэнткам прадоўжыць тэрмін умоўнага высялення з абавязковым кантролем з боку жыллёва-бытавой камісіі.**

**...Тэрміновыя справы вырашаны, адкладзены ў бок паперы — пасяджэнне можна закончыць.**

**— Хвіліначку! — усміхаецца Генадзь Пальчык. — Некалькі слоў нам хоча сказаць госць.**

**Госць — старшыня жылбыткамісіі прафкома універсітэта Барыс Сачанка — выконвае сёння прыемную місію: пад дружныя апладысменты ўручае Генадзю пераходны вымпел і грамату за трэцяе месца, занятае інтэрнатам № 2 у сацыялістычным спаборніцтве паміж інтэрнатамі БДУ.**

**Шлях ад апошняга (на якім некалі лічыўся гэты корпус) да трэцяга месца нялёгкі. Тым больш, што нядаўна састаў студсавета прыкметна абнавіўся. Ад папярэднікаў засталася незайздросная спадчына — работа ў мінулым годзе вялася не лепшым чынам.**

**Новыя гаспадары па-новаму заявілі аб сабе. Няма зараз у інтэрнаце студэнта, які б не быў у курсе справы студэнцкага савета. Пасля кожнага пасяджэння на вялікім стэндзе ў вестыбюлі паяўляецца выпіска з рашэння студсавета. Наладжана сістэма дзяжурстваў на вахце і на паверхах, няма нараканняў на работу лектарскай групы.**

**У інтэрнаце жывуць студэнты двух факультэтаў — фізічнага і журналістыкі. Саюз «фізікаў» і «лірыкаў» даў нядрэнныя вынікі: студэнты доўга затрымліваюцца ля насценгазеты, афармленай журналістамі, цікава праводзяць час у пакоі тэхнічнай творчасці.**

**— Гэта ўжо справа рук фізікаў, — падводзіць мяне да селектарнай устаноўкі Генадзь. — Патрэбна вахцёру толькі шчоўкнуць пераключальнікам — і ён можа звязацца з дзяжурным любога паверха.**

**Абноўлены састаў студсавета дакладна вызначыў галоўны кірунак, якога і прытрымліваецца ў сваёй дзейнасці,—гэта работа з людзьмі. Заключаецца яна не толькі ў разглядзе негатыўных выпадкаў, а больш ва ўменні прыслухоўвацца да голасу жыхароў. Іменна так студсавет зможа заваяваць сабе аўтарытэт — лічаць студэнты.**

**У мінулым годзе шмат гаварылася аб дрэннай дастаўцы газет — яны затрымліваліся ля стала вахцёра, і далёка не ўсе падпісчыкі атрымлівалі свае выданні. Зараз дзяжурны разносіць пошту па паверхах.**

**— На жаль, мы яшчэ не можам вырашыць самастойна ўсе пытанні, кончыць з цяжкасцямі, — працягвае Генадзь.— Колькі разоў гутарылі з адміністрацыяй наконт новай мэблі (старая даўно ўжо аджыла свой век), запрашалі старшыню прафкома, а вынікаў пакуль не відаць. А студэнты ідуць да нас з такімі пытаннямі кожны дзень.**

**...Пасяджэнне студсавета закончылася позна. Ды гэта нікога і не здзівіла. Галоўнае, прыняты рашэнні, за якімі будзе справа. Што ні кажыце, а быт — справа далёка не дзесятая.**

**В. ЖДАНКО,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# Спартакіяда завяршылася



САМЫМІ ПАПУЛЯРНЫМІ спаборніцтвамі паміж замежнымі навучэнцамі з'яўляецца гарадская спартакіяда, якая праводзіцца па лініі гарадскога савета па справах замежных навучэнцаў Мінгарвыканкома. Нядаўна фінішыравала спартакіяда-83, якая праводзілася дзевяты раз.

Інтэнсіўна рыхтаваліся да старту спартакіяды зямляцтвы замежных навучэнцаў нашага універсітэта. У спартыўных залах галоўнага і філалагічнага карпусоў часта можна было бачыць замежных студэнтаў: адны гулялі ў валейбол, другія — у настольны тэніс, трэція — у баскетбол, чацвёртыя пад раўнамерныя ўдары метранома прабягалі круг за кругам па зале, адпрацоўваючы тэхніку бегу. Рыхтаваліся і футбалісты, якія, як толькі дазволіла надвор'е, выйшлі з залы на футбольнае поле.

Рэгулярныя трэніроўкі чаргаваліся з турнірамі, якія праводзіліся паміж зямляцтвамі. Актыўны ўдзел у трэніроўках, у падрыхтоўцы зборных каманд па асобных відах, якія павінны былі абараняць гонар універсітэта на гарадскіх спаборніцтвах, прымалі прадстаўнікі зямляцтваў ГДР, Кубы, Алжыра, В'етнама, Чэхаславакіі, Мадагаскара, Афганістана, Малі.

У праграме гарадской спартакіяды — спаборніцтвы па шасці відах спорту, сярод якіх, акрамя іграх відаў (валейбола, баскетбола, настольнага тэніса) былі таксама лёгкая атлетыка і нават такі нязвыклы для жыхароў паўднёвых краін від, як лыжы.

Адным з этапаў падрыхтоўкі да гарадской спартакіяды з'явілася VIII агульнауніверсітэцкая спартакіяда замежных навучэнцаў, у якой удзельнічалі зборныя каманды зямляцтваў і факультэтаў: падрыхтоўчага і журналістыкі.

На базе каманд-пераможцаў былі сфарміраваны зборныя каманды універсітэта. Зямляцтвы ЧССР і ГДР рыхтавалі каманды па лыжах, валейболу, лёгкай атлетыцы; зямляцтва В'етнама — па настольнаму тэнісу; Мадагаскара і Кубы — па баскетболу і футболу.

Шмат сіл, энергіі, часу аддае студэнцкаму спорту старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту А. І. Яфімаў, які з'яўляецца адказным за спартыўна-масавую работу сярод замежных навучэнцаў універсітэта. У тых поспехах, якіх дабіваліся яго выхаванцы на мінулых спартакіядах, у той папулярнасці, якой карыстаецца спорт у замежных навучэнцаў, — вялікая яго заслуга.

Паспяхова выступілі каманды універсітэта і ў гэтым годзе, заняўшы трэцяе месца. Нашы студэнты былі трэцімі ў спаборніцтвах па баскетболу, валейболу, настольнаму тэнісу і лёгкай атлетыцы, чацвёртымі — у лыжных спаборніцтвах, і толькі ў футболе нам дасталася шостае месца.

У цэлым каманды універсітэта паказалі добрыя вынікі, хаця па баскетболу, настольнаму тэнісу і футболу мы маглі б выступіць значна лепш, калі б усе члены зборных каманд былі больш арганізаванымі. Пасля падвядзення вынікаў спартакіяды хочацца адзначыць лепшых спартсменаў, якія дапамаглі паспяховаму выступленню універсітэцкай зборнай: Лібор Носек — лыжы (ЧССР), Таксін Шарадка — валейбол, лёгкая атлетыка (Іарданія), дружная пяцёрка баскетбалістаў з Мадагаскара, Эміліо Перас — баскетбол (Куба), Айнер Брозе —лёгкая атлетыка (ГДР), Нгуен Ван Хоанг — настольны тэніс (СРВ).

**У. БУДАЙ,**
**кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.**

**НА ЗДЫМКУ:** адзін з **момантаў спартыўнага турніра.**

Фота **аўтара.**

---

БАСКЕТБОЛ

## ТАК ТРЫМАЦЬ!

УПЕРШЫНЮ беларускія баскетбалісткі на Спартакіядзе народаў СССР занялі трэцяе месца. Для нас гэта ўдвайне прыемна, таму што ў саставе каманды выступалі студэнтка 3-га курса хімічнага факультэта Алена Дадычына і студэнтка 1-га курса факультэта журналістыкі, двухразовая чэмпіёнка Еўропы, майстар спорту СССР міжнароднага класа Галіна Савіцкая. Яны сталі героямі спартакіяднага турніра ў Маскве.

Матч БССР—Масква ішоў ачко ў ачко. Маскоўская каманда, аснову якой складалі баскетбалісткі ЦСКА—сярэбранага прызёра чэмпіяната СССР, імкнулася да перамогі. У такі напружаны момант на пляцоўку выйшла Алена Дадычына, рост якой усяго 164 сантыметры. Але Лена не разгубілася і тройчы закінула мяч у кальцо, тым самым рашыўшы вынік матча. 72:71—перамаглі беларускія баскетбалісткі.

А капітан Галіна Савіцкая была душой каманды. Яна стала адной з лепшых баскетбалістак на турніры. Галіна набрала ў дзевяці матчах 193 ачкі і заняла першае месца ў спрэчцы бамбардзіраў. Савіцкая — кандыдат у зборную СССР, якая ў канцы лета будзе абараняць свой чэмпіёнскі тытул на чэмпіянаце свету.

Віншуем вас, дзяўчаты, і жадаем новых поспехаў! Думаецца, што баскетбалістак падтрымаюць астатнія спартсмены універсітэта, якія ў саставе зборнай рэспублікі рыхтуюцца выступіць у фіналах VIII летняй спартакіяды народаў СССР.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**член праўлення спартыўнага клуба універсітэта.**

---

Закончылася XXXI спартакіяда універсітэта. З яе канчатковымі рэзультатамі мы пазнаёмім чытачоў у наступным нумары. Сёння друкуем вынікі апошніх спаборніцтваў. Набраныя ачкі факультэтамі ідуць у залік спартакіяды.

| | в-с | г-с | г-м | ар | ц-а | м-н | н-т | л-а |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| юрфак | 183 | 220 | — | 40 | 259 | 180 | — | 301,5 |
| мехмат | 136 | 270 | — | 150 | 62 | 120 | 120 | 362 |
| ФПМ | — | 22 | — | 180 | — | 90 | 180 | 200 |
| фізфак | 94 | 13 | — | 120 | — | 80 | 90 | 189,5 |
| радыёфізікі і электронікі | — | 63 | — | 70 | — | 150 | 150 | 198,5 |
| гістфак | 121 | — | 159 | 30 | 200 | 60 | — | 88 |
| журфак | — | — | 97 | 80 | — | 50 | 60 | 11 |
| хімфак | — | — | — | 50 | — | 70 | — | 122 |
| геафак | — | 41 | — | 90 | 48 | 30 | 80 | 55 |
| біяфак | — | — | — | 60 | — | 20 | 70 | 63 |
| філфак | — | — | 76 | — | — | 40 | — | 88 |

Заўвага: в-с — веласпорт, г-с — гімнастыка спартыўная, г-м — гімнастыка мастацкая, ар—спартыўнае арыенціраванне, ц-а — цяжкая атлетыка, м-н — мнагабор'е ГПА (летняе), н-т — настольны тэніс, л-а — лёгкая атлетыка.

---

ВАЛЕЙБОЛ

## Сябры сустракаюцца ў Мінску

СЯРОД ШМАТЛІКІХ груп, каманд, секцый супрацоўнікаў універсітэта найбольш актыўна працуе секцыя па валейболу. Гэты від спорту прыцягвае ўвагу не толькі мужчын, але і жанчын. У першынстве універсітэта ўдзельнічае не менш дзесяці жаночых каманд. Жаночая зборная таксама нядрэнна выступае ў першынстве Мінска сярод супрацоўнікаў і выкладчыкаў ВНУ. У календары спаборніцтваў—і сустрэчы з камандамі іншых універсітэтаў. Вось ужо шмат гадоў сустракаюцца нашы валейбалісткі з камандай супрацоўнікаў Тартускага універсітэта. У гэтым годзе гульні праводзіліся ў Мінску. Наша каманда перамагла. Асабліва добрай гульнёй вызначыліся Л. Калацкая (факультэт радыёфізікі і электронікі), В. Сінякова (геафак), Р. Сакалова (фізфак).

Нашы госці пазнаёміліся з горадам, з універсітэтам. Развітваючыся, яны паабяцалі ўзяць рэванш у наступнай сустрэчы ў Тарту.

**В. ДЗМІТРЫЕВА.**



*ЗВЫШ 500 ЮНАКОЎ і дзяўчат, студэнтаў першага і другога курсаў, у саставе груп па навучанню плаванню наведваюць рэспубліканскі Палац воднага спорту. Працягласць заняткаў — адна акадэмічная гадзіна, але хто пастаянна ходзіць сюды з жаданнем пасябраваць з вадой, хутка свабодна адчувае сябе на любой глыбіні. А да канца года амаль усе здаюць нормы ГПА. Наш карэспандэнт пабываў на занятках па плаванню ў першакурснікаў юрфака.*

*НА ЗДЫМКАХ: рэспубліканскі Палац воднага спорту; вада — гэта бадзёрасць, здароўе, адпачынак.*

Фота **В. Шачака.**



---

ТРЫВОЖНЫ ФАКТ

## НА КРОС НЕ ВЫЙШЛІ

НАЙБОЛЬШ ДАСТУПНАЙ формай спаборніцтваў для людзей сярэдняга і старэйшага ўзросту з'яўляюцца спаборніцтвы па кросу. Здаецца, вось дзе могуць праявіць сваю фізічную падрыхтаванасць, узровень натрэніраванасці, ды і проста памерацца сілай супрацоўнікі універсітэта. Стадыён, бегавыя трасы, судзейская калегія былі гатовы для правядзення сапраўды масавых спаборніцтваў, якія ўваходзяць у праграму спартакіяды «Здароўе».

Але, на жаль, да пачатку спаборніцтваў былі гатовы крыху больш за сорак чалавек. Дарэчы, трэцюю частку з іх складалі супрацоўнікі механіка-матэматычнага факультэта (адказны за спартыўна-масавую работу В. Балашчанка). Пяць чалавек прадстаўлялі біялагічны факультэт (адказны Н. Грыц), па аднаму чалавеку былі ад факультэта прыкладной матэматыкі і ВЦ.

І больш за ўсё здзіўляе тое, што на старт не выйшлі супрацоўнікі і выкладчыкі фізічнага факультэта, хоць на судзейскай калегіі прысутнічаў іх прадстаўнік А. Гаварун. Ніхто не бачыў на спаборніцтвах па кросу каманд геаграфічнага, хімічнага факультэтаў. Безадказна аднесліся да фарміравання каманды на вылічальным цэнтры. А супрацоўнікі ж ВЦ раней заўсёды задавалі тон у спаборніцтвах па кросу.

Прафсаюзным бюро падраздзяленняў, відаць, патрэбна заслухаць справаздачы адказных за спартыўна-масавую работу, разгледзець недахопы, ажывіць фізкультурную актыўнасць сваіх супрацоўнікаў.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

2 чэрвеня 1983 г.

Зак. 1003. АТ 04272

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ